ISSN 2351-6658
ISSN (ONLINE) 2351-6666

# ПАРАЎНАННЕ СІМВАЛІЧНЫХ ФУНКЦЫЙ ПАЯСОЎ ВАЛОЖЫНШЧЫНЫ І ПАЯСОЎ ГРОДЗЕНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

**АЛЕНА ЛЯШКЕВІЧ**

***Анатацыя:*** У артыкуле параўноўваюцца звесткі, запісаныя аўтаркай ад Марыі Стасяловіч з вёскі Сакаўшчына Валожынскага раёна з матэрыялам, зафіксаваным ў Гродзенскай вобласці. Валожыншчына знаходзіцца на памежжы гістарычна-этнаграфічных рэгіёнаў Цэнтральная Беларусь і Панямонне. Гэта адлюстравалася ў асаблівасцях вырабу і ўжывання традыцыйных паясоў. Асноўныя сімвалічныя функцыі паясоў у рэгіёне: камунікацыйная, інтэграцыйная, забеспячэнне дабрабыту, ідэнтыфікацыя па поле і ўзросце, сацыяльным статусе.

***Ключавыя словы:*** традыцыйныя паясы, рытуал, сімвалічныя функцыі, Валожыншчына.

# COMPARING THE SYMBOLIC FUNCTIONS OF TRADITIONAL BELTS FROM VALOŽYN AREA AND HRODNA REGION

***Abstract:*** The author compares the data recorded in the village Sakaŭščyna (Valožyn district) with the material recorded in the Hrodna region. Valožyn district is located in the transitional area between two ethnographic regions: Central Belarus and the region of the river Nioman. This was reflected in the peculiarities of making and using traditional belts. Basic symbolic functions of belts in this region are communicative, integrative, ensuring the welfare, showing gender- social- and age- identity.

***Keywords:*** Traditional Belt, Symbolic Functions, Valožyn District.

Валожыншчына з’яўляецца пераходнай зонай паміж гістарычна-этнаграфічнымі рэгіёнамі Цэнтральная Беларусь і Панямонне. Гэта адлюстравалася ў асаблівасцях вырабу і ўжывання традыцыйных паясоў: арсенал арнаментаў валожынскіх паясоў мае шмат агульнага з паясамі суседняга Панямоння, аднак ён вузейшы.

Валожынскія паясы – гэта ўзорыстыя “тасёмкі”, шырыня якіх не перавышае 2 см. Пераважаюць адценні барвовага, белага альбо шэрага і ружовага колераў. Дапаўненнем служаць ніткі чорнага, зялёнага, жоўтага, фіялетавага колераў. Канцы паясоў аздабляюцца кутасамі і махрамі (Боганева і інш., 2011: 812).

Перад нараджэннем дзіцяці ткалі пояс-“спавівік”, для дзяўчынкі – чырвоны ці ружовы, для хлопчыка – сіні ці зялёны. Такі пояс быў шырэйшы і даўжэйшы за пояс, што насілі дарослыя, бо спавівікам трэба было абвязаць немаўля крыж-накрыж, *“каб ручкі-ножкі роўненькія былі”.* (Запісана аўтаркай ад М. М. Стасяловіч 1923 года нараджэння, вёска Сакаўшчына Валожынскага раёна) Звесткі пра такую ж дыферэнцыяцыю дзіцячых паясоў па колеры ў залежнасці ад полу немаўляці зафіксаваны і на Панямонні (Боганева і інш., 2006: 657).

Яшчэ ў пасляваенныя гады ў Валожынскім раёне дзяўчыне перад вяселлем трэба было назапасіць паясоў (Боганева і інш., 2011: 813).

На заручынах маці маладой насыпала ў бутэльку жыта, абвязвала яе ручніком ці хусткай і абкручвала поясам крыж-накрыж *“як дзіця”* (Стасяловіч, асабістая размова). Такі ж звычай зафіксаваны ў Навагрудскім раёне. Яго ж апісваў у канцы XIX стагоддзя ў Ваўкавыскім павеце даследчык М. Федароўскі (Боганева і інш., 2006: 658).

Ва ўсіх прыведзеных прыкладах прыналежнасць пояса не акцэнтуецца. Альберт Байбурын згадвае, не пазначаючы мясцовасць,, што дзяўчына ў знак згоды на шлюб здымала свой пояс, абмотвала ім бутэльку і аддавала яе сватам. (Байбурин, 1992: 7) Алег Лысенка лічыць пояс у адносінах да жаночага пачатку сімвалам цнатлівасці. Ён піша, што развязванне маладым пояса маладой у вясельным рытуале пазначала падначаленне маладой, іх сімвалічнае паяднанне (Лысенко, Комарова, 1992: 16).

Свату на вяселлі завязвалі пояс паверх ручніка, праз правае плячо. Поясам упрыгожвалі шыю каню, што вёз маладых (Стасяловіч, асабістая размова). Такі ж звычай вядомы ў Наваградскім раёне, а таксама ў літоўцаў Дзукіі (Боганева і інш., 2006: 661). Можна пагадзіцца з думкай Алега Лысенкі, што паясы служылі маркіроўкай вясельных чыноў і ўсяго вяселля (Лысенко, 1992: 16).

Дорачы паясы, маладыя *“выкуплівалі сабе месца”* за вясельным сталом. Калі маладых сустракалі бацькі маладога, то нявеста дарыла

свякрусе палатно ці хустку, а свёкру – пояс. Такія ж падарункі маладая жонка давала бацькам мужа, выходзячы ўпершыню ў статусе замужняй жанчыны на жніво. На другі дзень вяселля маладая клала паяскі на прыпечак, на студню, вязала на венік (Стасяловіч, асабстая размова).

Згадкі аб выкарыстанні вялікай колькасці паясоў падчас традыцыйнага вяселля зафіксаваны і ў Гродзенскай вобласці (Боганева і інш., 2006: 657–666). Дасьледчык Васіль Ліцвінка лічыў, што дарэнне паясоў на вяселлі сімвалізуе ўступленне маладой у род маладога. Вешанне паясоў на другі дзень вяселля ён разглядае як праграмаванне дабрабыту ў гаспадарцы, кіданне пояса на печ – як спробу задобрыць духаў хаты, продкаў (Ліцвінка, 1994: 16). Альберт Байбурын у звычаі кідання маладой паясоў на печ і ў іншыя месцы ў гаспадарцы мужа бачыў ідэю маркіравання сваёй, засваення чужой прасторы (Байбурин, 1992: 8).

М. М. Стасяловіч сярод прадметаў і локусаў, дзе маладая пакідала паясы на другі дзень вяселля, называе толькі прыпечак, студню і венік. Інфарманты на Гарадзеншчыне, акрамя трох пазначаных яшчэ ў 2000 годзе, згадвалі дзяжу, чапялу, патэльню, даёнку, начоўкі, прасніцу, цэп, дровы. У XIX стагоддзі згадваліся таксама кладка на рацэ, дзе маладая ўпершыню мыла бялізну, авечнік, аборы, хлеў, куратнік (Боганева і інш., 2006: 662–663).

На Валожыншчыне сустракаюцца згадкі ўжывання паясоў падчас пахавальнага абраду, што характэрна для традыцыйнай культуры Панямоння. М. М. Стасяловіч паведаміла, што некалі кашулька і пояс, у якіх хрысцілі дзіця, захоўваліся аж да смерці чалавека і клаліся з ім у труну. Каня, які вёз труну з нябожчыкам, вялі на поясе спасылка?.

У 2012 годзе аўтаркай былі выяўлены паясы, сатканыя адмыслова “на смерць”, у вёсцы Руда Ліпічанская Мастоўскага раёна. Паясы прызначаліся для таго, каб быць пакладзенымі ў труну *“пад пакойніка”.* Класці іх маглі толькі родныя памерлага, упоперак, канцы паясоў у труну не запраўлялі, яны віселі. Верылі, што пояс нябожчык пакіне на кладцы, якую яму трэба перайсці на тым свеце. Апошнімі часамі замест пояса ў труну кладуць суконныя ніткі (Шэршань, асабістая размова) Магчыма, тая кладка сімвалізуе пераход між “гэтым” і “тым” светам. Прыгадайма звычай маладой на другі дзень вяселля пакідаць паясы ўсюды, куды яна ўпершыню прыходзіць у новай гаспадарцы. Магчыма, пояс служыў своеасаблівым маркерам засвоенай новай прасторы, артэфактам, патрэбным для здзяйснення пераходу дзяўчына-жанчына і жывы-памерлы.

У вёсцы Алексічы Зэльвенскага раёна пра пахавальны пояс кажуць: *“Яму гэта кладачка, пераход, пояс”.* У Навагрудскім раёне сустракаюцца павер’і, што чалавек будзе ўставаць, трымаючыся за пояс, на Страшны

суд, што на тым свеце нябожчыка на гэтым пояску павядуць у рай (Боганева і інш., 2006: 666–667) Алег Лысенка (Лысенко, 1992: 17). лічыць галоўнай камунікацыйную функцыю паясоў, якія выкарыстоўвалі ў пахавальных абрадах – забеспячэнне сувязі між светам жывых і светам памерлых.

Што да каляндарных абрадаў, то Марыя Мікалаеўна Стасяловіч паведаміла аб выкарыстанні паясоў падчас Зажынак і Дажынак. Пояс дарыла маладуха свякрусе ў першы год замужжа, ідучы на жніво. Поясам абвязвалі зажыначны сноп, што стаяў усю зіму ў хаце на покуці. Гэты сноп звалі *“Гаспадар”*. Такія ж звычаі зафіксаваны і ў вёсцы Дуброўня Лідскага раёна (Боганева і інш., 2006: 663).

Такім чынам, звесткі, запісаныя аўтаркай ад Марыі Мікалаеўны Стасяловіч, сведчаць аб падабенстве сімвалічных функцый паясоў Валожыншчыны і паясоў суседняй Гродненскай вобласці.

Асноўныя сімвалічныя функцыі паясоў у рэгіёне:

- ідэнтыфікацыя па поле і ўзросце, сацыяльным статусе: пояс, што ткалі для немаўля, адрозніваўся па колеры ў залежнасці ад полу дзіцяці і адрозніваўся ад паясоў, што насілі дарослыя; пояс у вясельным абрадзе выкарыстоўваўся як сімвал цнатлівасці маладой і маркіраваў удзельнікаў вяселля;
- забеспячэнне дабрабыту: раскідванне маладой паясоў на другі дзень вяселля, выкарыстанне паясоў у жніўных абрадах;
- камунікацыйная – забеспячэнне сувязі між светам жывых і светам памерлых пры дапамозе выкарыстання паясоў у пахавальных абрадах, дараванне пояса сватам як адлюстраванне згоды на шлюб;
- інтэграцыйная – раздорванне маладой паясоў родным маладога на вяселлі як знак далучэння да яго роду.

### *Бібліяграфія*

1. Байбурин, Альберт (1992). “Пояс (к семиотике вещей)”, *Из культурного наследия народов Восточной Европы.* Санкт-Петербург: Наука: 5–13.

2. Боганева, Алена і інш. (2006). Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 3. Гродзенскае Панямонне. У 2 кн. Кн. 2. Мінск: Вышэйшая школа.

3. Боганева, Алена і інш. (2011). Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 5. Цэнтральная Беларусь. У 2 кн. Кн. 2. Мінск: Вышэйшая школа.

4. Ліцвінка, Васіль (1994). “Сімволіка пояса ў беларускім фальклоры”, *Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі “Народныя паясы – ма-*

*стацтва і рамяство" Мінск, 10–11 снежня 1992 года.* Мінск: Беларускі інстытут праблем культуры: 15–19.

5. Лысенко, Олег и Комарова, Светлана (1992). Ткань, ритуал, человек. Традиции ткачества славян Восточной Европы. Санкт-Петербург.

6. Стасяловіч Марыя Мікалаеўна 1927 года нараджэння, нарадзілася і жыве ў аграгарадку Сакаўшчына Валожынскага раёна Мінскай вобласці.

7. Шэршань Алена Юльянаўна 1944 года нараджэння, нарадзілася ў вёсцы Пушча Ліпічанская, жыве ў вёсцы Руда Ліпічанская Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці.